# ПЛЕНАРНОЕ ЗАСЕДАНИЕ

## АСОБА ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Давыдовіч Марыя, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кансультант – старшы выкладчык Носік Алеся Анатольеўна*

Анатацыя. Артыкул прысвечаны асобе Еўфрасінні Полацкай, яе асветніцкай дзейнасці і ролі ў станаўленні беларускай культуры і дзяржаўнасці.
*Ключавыя словы: Еўфрасіння Полацкая, беларуская асветніца, гісторыя, літаратура.*

Беларуская зямля здаўна славілася імёнамі сваіх знакамітых сыноў і дачок. Жылі яны ў розныя часы, нярэдка аддаленыя ад нас не адным стагоддзем, аднак аднолькава шчыра былі адданыя Бацькаўшчыне. І найчасцей галоўная зброя ў іх была адна – веды. Памяталі яны: веды – тое святло, што, запаленае аднойчы, здольна нязгаснай лампадай свяціць скрозь вякі. Несла нязгаснае святло ведаў і славутая палачанка Еўфрасіння Полацкая.

І сапраўды, без яе немагчыма ўявіць не толькі духоўнае жыццё на ўсходнеславянскіх землях у XII ст., але і шматвяковую гісторыю нашай Радзімы. Князёўна, ігуменне, асветніца, святая... Яе імя заўсёды будзе выклікаць самыя цёплыя пачуцці ў душах нашчадкаў. Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што вобраз Еўфрасінні Полацкай ва ўсе часы быў крыніцай натхнення майстроў слова, жывапісу, архітэктуры, а таксама звычайных людзей, якія проста любяць свой край.

Жыццёвы шлях вялікай асветніцы быў нялёгкім. З ранніх гадоў Прадслава ўражвала ўсіх сваёй прыгажосцю і здольнасцямі да навукі. Усе ёй прараквалі багатае і шляхетнае жыццё ў будучым, але дзяўчына выбрала іншы шлях. Пад імем Еўфрасінні таемна ад усіх яна прыняла манаскі пострыг, каб прысвяціць сябе духоўнаму служэнню. З гэтага і пачалася яе вялікая асветніцкая дзейнасць: Еўфрасіння перапісвала шмат царкоўных кніг, перакладала з грэчаскай мовы на лацінскую, пісала ўласныя творы-малітвы. Шмат сіл было накіравана на пашырэнне пісьмовага слова.

Ў 50-я гады XII ст. на яе замову дойлід Іаан збудаваў за 30 тыдняў храм Спаса – найвыдатнейшы мастацкі помнік полацкай архітэктурнай школы, які захаваўся да нашых дзён. Па яе загаду Лазарам Богшам быў створаны знакаміты крыж, які стаў нацыянальнай святыняй Беларусі. Еўфрасіння Полацкая на схіле жыцця здзейсніла паломніцтва ў Святую зямлю, дзе і завяршыўся яе зямны шлях.

Асноўныя звесткі захоўваюцца ў самым старажытным і самым першым літаратурным тэксце, прысвечаным праваслаўнай падзвіжніцы – «Жыціі Еўфрасінні Полацкай». Гэты знакаміты твор невядомага аўтара (магчыма,



Репозиторий БГМУ

ігумена мужчынскага манастыра Міхаіла) быў напісаны праз паўстагоддзя пасля смерці асветніцы.

Бадай, самы значны ўплыў духоўнай справы Еўфрасінні зазнала літаратура. Жывое славянскае слова, над распаўсюджаннем якога так шчыравала наша зямлячка, перарасло яе імем у літаратурных творах XXст.

Гістарычная праўда, якую захавала «Жыціе», у аповесці Вольгі Іпатавай «Прадыслава» пераплялася з мастацкай выдумкай. Твор увабраў сюжэтную канву «Жыція», напоўніўся рэальнымі падзеям (год нараджэння гераіні, звесткі пра сям'ю Георгія, пра адукацыю і г.д.). Але разам з тым рэальна-прататыпнае пісьменіца ўзбагаціла творчай фантазіяй. У аповесці Еўфрасіння паказана не як іканапісная святая, а як зямны чалавек з зямнымі думкамі і пачуццямі.

У аповесці Вольга Іпатава дакладна апісала жыццёвы шлях Прадыславы, гістарычныя абставіны, у якіх яна жыла, тагачасныя гістарычныя ўмовы. Гэта інфармацыі дае магчымасць прасачыць за сталеннем гераіні, убачыць напрамкі яе дзейнасці і адзначыць праявы яе характару.

Такім чынам, у творы Вольгі Іпатавай Еўфрасіння Полацкая паказваецца як асветніца, асоба незвычайнай духоўнай прыгажосці і абаяльнасці, падзвіжніца, моцная і строгая, настойлівая і самаахвярная жанчына.

Не губляюць цікавасці да вобразу славутай палачанкі і іншыя сучасныя аўтары. Полацкай князёўне прысвяціў свой твор беларускі драматург Аляксей Дудараў. Яго п'еса «Крыж» прысвечана дзеячам айчыннай гісторыі і культуры – Рагнедзе, Барбары Радзівіл, Еўфрасінні Полацкай. Асветніцца ў творы паўстае як рэальная гістарычная асоба і як сімвалічнае ўвасабленне духоўнасці.

Філасофскім сэнсам вызначаецца паэма Дануты Бічэль-Загнетавай «Еўфрасіння Полацкая». Яна па-асабліваму распавядае чытачу пра ігуменню. Твор падзелены на сем частак, кожная з якіх прысвечана асобнаму этапу жыцця асветніцы. Паэтэса ўсхваляе асветніцу за яе нізлічоную дзейнасць, за ўздым Полацка.

*Узышла высока асветы эпоха.*
*Колькі ж нарадзілася дужых дзяўчат,*
*каб у дванаццаць звярнуцца да Бога*
*і павандраваць да яго ў пяцьдзясят.*

У вершы Алеся Звонака «Цень Еўфрасінні» чытачу даецца магчымасць прайсці па тых месцах, дзе жыла Святая Еўфрасіння. Чытаючы радкі верша, можна адчуць абстаноўку тых месцаў, пра якія нам гаворыць аўтар. Праз кожны сказ твора адчуваецца хваляванне паэта, нібыта ён ідзе па прыступках, дзе калісьці хадзіла ігуменння.

*Пахла воскам у прыцемку сінім.*
*І здавалася, з дна тайнікоў*
*Свецяць вочы вялікай княгіні...*
*Гэта здань твая, Ефрасіння,*
*Мільганула з глыбінь вякоў!*

Такім чынам, вобраз Еўфрасінні Полацкай займае пачэснае месца ў беларускай літаратуры розных вякоў. У творах асветніца падаецца па-рознаму,

яе вобраз прадстаўлены ў выглядзе двух канцэптуальных асноўных падыходаў: з аднаго боку, Еўфрасіння выступае як падзвіжніца, чалавек з незвычайным лёсам, як сімвал жыцця і духоўнасці беларусаў. З другога – як звычайная жанчына, якая усё жыццё перамагае ў сабе першародныя пачаткі дзеля спасціжэння вышэйшай Боскай святасці і духоўнасці.

## Літаратура

1. Арлоў, У. Еўфрасіння Полацкая/ У.Арлоў. – Мінск: Маст.літ, 1992. – 220 с.
2. Бічэль-Загнетава, Д. Еўфрасіння Полацкая: вершы//Беларус.-1988.-№1
3. Дамарад, І. «Князёўнай полацкаю пачаты…»: аповесць «Прадыслава» Вольгі Іпатавай/І. Дамарад//Род.слова.-2004.-№8.-С.8-11.
4. Воюш, І. «Я – вясна непаўторная!...»: вобраз Еўфрасінні Полацкай у беларускай літаратуры/І.Воюш//Род. слова.-2004.-№1.-с.32-35
5. Дамарад, І.І. Ля вытокаў гістарызму/І.І. Дамарад//Веснік БДУ.-2002.-№1.-с.78-80
6. Чыгрынаў, І. Звон – не малітва: п’есы // І.Чыгрынаў.-Мінск:Маст.літ. – 1993.

# PERSONALITY EUPHROSYNE IN THE CONTEXT OF THE BELARUSIAN STATEHOOD

**Davidovich Maria, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific Supervisor: Senior Lecturer Nosik A.A.*

Abstract. The article is devoted to the person of Euphrosyne, its outreach and role in the development of the Belarusian culture and statehood.
*Keywords*: *Euphrosyne of Polotsk, Belarusian educator, history, literature.*

Репозиторий БГМУ